Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Клянніцкая базавая школа»
#гордимся_верим_поздравляем_2024

## На варце свету і Радзімы

На варце свету і Радзімы
Стаяць адважныя байцы,
Склад думак у ва ўсіх адзіны,
Нязломны ў помыслах яны.
Іх мужнасць, гераізм і сіла
Хвалюе хлопцаў і дзяўчат.
Пісаць пісьмо ад нашай школы
Прыйшлося мне не ў першы раз.
Мы вамі вельмі ганарымся,
На варце кожны з вас заўжды,
Абараняеце вы пільна
Радзімы нашай рубяжы.
Вас не турбуе снег і холад,
Спякота не хвалюе вас,
З вялікай годнасцю на службе
Выконваеце дзядоў наказ:
Каб мы спакойна спалі ў хатах,
Жаўрук павольна ўвысь узлятаў,
Каб бусел на Радзіму ўвесну
Без перашкодаў далятаў.
І каб сады цвілі наўкола,
Паветра чыстым, каб было,
Шумела галасамі школа,
Дзяцей гаротных не было.
Служыце дбайна, пільна, хлопцы!
Вы сіла, моц маёй зямлі
Свой талент, мужнасць праявіце,
Каб у свеце не было вайны.
Мы вам жадаем усёй школай,
Каб вы здаровымі былі,
Каб вам свяціла ярка сонца,
Каб вы не ведалі бяды!
Каб служба вам была ў радасць,
Каб вы шчаслівымі былі,
Каб у сям`і ў вас быў парадак,
Каб шчасця ўсім вы даць змаглі!










В рамках АРТ-проекта «На страже Родины и мира!» (письмо солдату)
Аўтар: Касцюкевіч І.М. вучань 7 класа.